# «Спыніся, час, хоць на імгненне вечнасці...»

*У новай кнігі — новы лёс Расце чытач, сталее аўтар...*
*Якой сустрэча будзе заўтра, Падкажа толькі мо Хрыстос...*

Сваю другую кнігу паэзіі Алесь Дуброўскі назваў “Непрадказальнасць дня”. Выдадзена яна ў ГДА “Барк”. Мы ж, чытаючы на вокладцы імя і прозвішча паэта, ужо адчуваем цікавасцьда яготворчасці. Нетолькі па-зямляцку (Аляксандр Сцяпанавіч родам з вёскі Целяшы Гомельскага раёна), але і з прафесійнага боку, бо Дуброўскі ўжо звыш чвэрці ста- годдзя працуе ў тэлерадыёкампаніі “Гомель”. А першая яго кніга лірыкі “І будзе лета апасля...” адкрыла нам цудоўнага паэта, з 'жаўруковай мовай, глыбокім веданнем жыцця, сваіх каранёў.

*Бо мы —*
*Радзімічы*
*З карэнным словам —*
*Род,*
*А з родных*
*І складаецца*
*Народ!*

— годна заяўляе Алесь у адным з вершаў свайго другога зборніка.

І ўсё жыццё паэта — з маленства (“дзівосны сон — дзяцінства дарагое, у штоніках запэцканых, на шлейцы”) да цяперашняга (“я сам, пабач, даўно не юны, жыццём, дай бог, надкусаны”) малюецца фарбамі-вобразамі вершаў. Азвышзадача паэта — “засяродзіцца на вечным". І ў Алеся Дуброўскага тэта атрымліваецца, бо прырода — вечная. Ён зна- ходзіцьтакія параўнанні, метафары, эпітэты, якія дапамагаюць адчуць непаўторнасць кожнай пары года, выяўна ўбачыць кожнае імгненне чалавечага жыцця. “Гайда ў вазок, — і хай капыцяць коні, сякуць у твар мароз і вецер шчодра...”,”а потым прыцемкі... і ноч пагодная ўсыпле зорамі абшар лясны”, “і снегіроў- караляў повязь зноў скоціцца на белую страху”, “тонуць ногі ў імхах, а на ўгрэтай паляне сон-трава мне здалёк усміхаецца”, “на небасхіл за поўняй наўздагонку акраёц сонца росны выплывав...”, “і затрапеча залатым адлівам лянівы лінь у мяк- кай асацэ...”

Светлымі жыццесцвярджальнымі эмоцыямі падпітваешся, чытаючы тэты зборнік. У ім ёсць і гумар, і тонкая самаіронія, і філасофія, якая прыходзіць з гадамі:

*Каму не верыць.*
*як жывым бацькам,*
*Калі спачылі — іхнім запаветам, Што скрозь жывуць*
*заможна толькі там,*
*Дзе нас няма...*
*І вынаходнікаў,*
*і самых модных творцаў*
*Расставіць па ранжыру непадкупны час..."*

Лірыка кахання... Багата старонак кнігі адведзена ёй. Алесь Дуброўскі аднолькава выдатна піша пра тэта святое і вечнае як рыфмаваным, так і белым вершам. Услухайцеся, колькі музыкі і пяшчоты ў гэтых радках:

*Сёння снежная замець*
*Намяла на парог*
*Ці ўспаміны на памяць,*
*Цісляды тваіх ног...*

А згадваючы другую лірычную ге- раіню, творца прызнаецца:

*Нас вянчала не лета — зіма,*
*Не арэлі люлялі — сумёты...*

У вершы “Курортная рапсодыя” такая карцінка:

*І сонца пырскі,*
*І гул прыбою,*
*І ты так блізка*
*Яшчэ са мною...*

Паэму-рэквіем “Трагедыя Пабужжа” Алесь Дуброўскі прысвяціў памяці Аркадзя Паўлавіча Набокіна, пенсіянера, які не пажадаў з’язджаць са сваёй выселенай вёскі на Веткаўшчыне і быў забіты злодзеямі. Праз трагедыю лёсу аднаго чалавека на апаленай Чарнобылем зямлі паэт выказвае перасцярогу: згубней за радыяцыю — бездухоўнасць, адарванасць ад радзімы:

*Ну, а старым,*
*Каму гады ў рады*
*І шлях такі вядомы —*
*Пад бярозы?..*
*Навошта іх чапаць было тады*
*І похапкам хутчэй*
*Вывозіць сярод ночы,*
*Сяліць у брукаванкі-гарады,*
*Дзе нават бусел жыць Стагоддзямі не хоча?*
*Навошта было рушыць*
*Іх уклад*
*І скарбу пазбаўляць,*
*Які жыццём нажыты?*
*Вось горкі вынік:*
*Нібы зарапад,*
*Яны заўчасна пакаціліся*
*З арбіты...*

Паэма і сапраўды гучыць рэквіемам па той зямельцы, што стала зонаю адчужэння. “Зямля нічыйнай не бывае!” — нагадвае паэт. Якую сімпатыю выклікае бусел — адухоўленная леная істота, што вясною вяртаецца да свайго гнязда:

*Круг заклаўшы пераможны*
*(Сустракай маўляў радзіма)*
*Прызямляўся асцярожна*
*На буслянцы, дзе нарадзіўся...*

*Кніга Алеся Дуброўскага атрымалася. Салідная заяўка да 60-годдзя, якое ён сення адзначае. Шчыра віншуем земляка з гэтай датай і прыняццем у рады грамадскага аб·яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі»*

**Тамара КРУЧЭНКА**